МІНСКІ ГАРАДСКІ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

пр. Незалежнасці, 8, 220030, г. Мінск
Тэл./факс (017) 218 00 90, 327 68 66

Р/р BY86BLBB36040100621571001001
у Дырэкцыі ААТ «Белінвестбанк»
па г. Мінску і Мінскай вобласці,
БІК BLBBBY2X

МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

пр. Независимости, 8, 220030, г. Минск
Тел./факс (017) 218 00 90, 327 68 66

Р/с BY86BLBB36040100621571001001
в Дирекции ОАО «Белинвестбанк»
по г. Минску и Минской области,
БИК BLBBBY2X

15.03.2024 № 6-7-1378эл

На № 29002400018010 ад

[redacted]

Аб разглядзе звароту

Мінгарвыканкам разгледзеў Ваш электронны зварот ад 01.03.2024 № 6-7-1378 эл. па пытанні перайменавання праспекта і прыпыначнага пункта Дзяржынскага на Ластоўскага і паведамляе наступнае.

У адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 10 Закона Рэспублікі Беларусь «О наименованиях географических объектов» ад 16.11.2010 № 190-З (далей – Закон) прысваенне найменняў састаўным часткам г.Мінска (элементы вулічна-дарожнай сеткі і прыраўнаваныя да іх элементы горадабудаўнічай планіровачнай структуры) і іх перайменаванне ажыццяўляе Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў.

Артыкулам 20 Закона вызначана, што прапановы аб прысваенні найменняў састаўным часткам населеных пунктаў і іх перайменаванні могуць уносіць мясцовыя Саветы дэпутатаў, выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя арганізацыі, а таксама грамадзяне пасля правядзення па гэтым пытанні мясцовага сходу або мясцовага рэферэндуму. Прапановы павінны ўтрымліваць абгрунтаванне неабходнасці прысваення наймення або перайменавання.

Прымаючы да ўвагі нязручнасці, якія створыць перайменаванне элементаў вулічна-дарожнай сеткі для грамадзян і арганізацый (пераафармленне дакументаў на права ўласнасці, унясенне змен у статутныя і іншыя дакументы), значныя фінансавыя выдаткі, камісія ўстрымліваецца ад перайменавання састаўных частак г.Мінска.

У адпаведнасці з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь «Об обращениях граждан и юридических лиц» ад 18.07.2011 № 300-З Вы маеце права абскардзіць вынікі разгляду звароту ў судовым парадку.

Намеснік старшыні А.М.Цуран

Брэль 272 43 45